Распаўсюджаным відам упрыгожванняў ва ўсходніх славян з'яўляліся бранзалетападобныя вітыя скроневыя кольцы. У Полацку знойдзены скроневыя кольцы крывічоў, выраблены з сагнутага бронзавага дроту. У дапаўненне да скроневых кольцаў славянскі жаночы гарнітур часам дапаўняўся рознымі ўпрыгожваннямі – шыйнымі грыўнямі, пярсцёнкамі і бранзалетамі (мал.6).

Сярод усіх упрыгожванняў, мабыць, менавіта бранзалеты маюць самую доўгую гісторыю. Яны прайшлі шлях ад амулетаў і абярэгаў да проста дэкаратыўных элементаў жаночага аблічча.

Першыя ўпрыгожванні, якія нагадваюць вонкавым выглядам сучасныя бранзалеты, з'явіліся яшчэ ў першабытных людзей. Іх стваралі з травы, кары дрэў, скуры жывёл, касцей, камянёў.

Хоць яны прымітыўна і ўпрыгожваліся разьбой і выпальваннем, але гэта ўжо гаворыць нам аб тым, што нават першабытныя людзі хацелі праявіць сваю індывідуальнасць.

Першабытныя бранзалеты ў самым пачатку свайго з'яўлення не выконвалі дэкаратыўную функцыю. Іх насілі, бо верылі ў іх сілу адганяць злых духаў, абараняць ад хвароб і прыносіць удачу.

Шырокія і тонкія, масіўныя і вытанчаныя – па колькасці і вазе бранзалетаў можна было меркаваць аб матэрыяльным дастатку і статусе ўладальніка ўпрыгожванняў.

У Дзянісавай пячоры (Алтай) у 2016 годзе быў знойдзены бранзалет узростам не менш за 40 000 гадоў.

У старажытнасці для мужчын бранзалет меў і практычнае значэнне. Шырокія бранзалеты абаранялі ўразлівыя ў баі або на паляванні запясці ад удараў халоднай зброяй і зубоў драпежных звяроў.

Для жанчын бранзалеты, вядома, не былі даспехамі: хутчэй талісманам і, як і ў мужчын, спосабам дэманстрацыі статусу і заможнасці. З цягам часу абярэгі сталі выконваць эстэтычную функцыю і нават пачалі вызначаць прыналежнасць да той ці іншай сацыяльнай групы (мал. 7 і 8).



Малюнак 7.



Малюнак 8.

**Скураны бранзалет-абярэг**.

Бранзалеты са скуры з’явіліся з пачаткам узнікнення рамяства мастацкай апрацоўкі скуры.

Упрыгожанні рабіліся мясцовымі майстрамі і былі вонкавым паказчыкам сацыяльнага становішча.

Бранзалет – гэта той жа абярэг. Ахоўныя і магічныя ўласцівасці звычайнаму бранзалету можа надаць пэўная сімволіка. Гэтак жа важная тэхніка завязвання вузлоў, перапляценняў.

Бранзалеты былі розных колераў. Важна разумець, якое значэнне хаваецца ў розных адценнях. Кожны з іх мае свой уласны сэнс, паведамляе пэўную інфармацыю.

Карычневы – адзінства з прыродай, практычнасць, спакой.
Чорны – трываласць, магутнасць, вытанчанасць, загадкавасць, панаванне.
Цёмна-зялёны – сардэчнасць, ціхамірнасць, любоў да прыроды.

У пачатку XX ст. у залежнасці ад геапалітычнай сітуацыі рамёствы па апрацоўцы скуры ў цэлым і вырабе скураных упрыгожванняў ў прыватнасці то развіваліся, то згасалі. Складанасці і перабоі былі звязаны з сістэмай сацыялістычнага размеркавання, парушэннем прынцыпу матэрыяльнай зацікаўленасці, адцяснення майстроў ад сродкаў вытворчасці.

У ваенныя і пасляваенныя гады ў сувязі з недахопам прамысловай прадукцыі адраджаюцца рамёствы і промыслы.

У далейшым, акрамя скургалантарэйных і абутковых фабрык, не арганізоўвалася ні мастацкіх арцеляў, ні фабрык па мастацкай апрацоўцы скуры. Тым не менш рамяство працягвала развівацца дзякуючы асобным майстрам і творчым майстэрням, якія працавалі ў традыцыях беларускага народнага мастацтва, так і ўвасабляючы сваё бачанне скураных вырабаў.

У нашыя дні рамяство мастацкай апрацоўкі скуры адраджаецца, у тым ліку дзякуючы таму, што ў мастацка-педагагічным арсенале педагогаў-мастакоў з’явіліся веды, уменні і навыкі ў гэтай галіне. Значыць, культурная традыцыя працягвае трансліравацца і развівацца праз мастацкую адукацыю як канал акумуляцыі культурнага вопыту народа.

## Працэс вырабу скуранага бранзалета

### 1. Пошук кампазіцыйнай формы.

Пачынаецца праца з выканання эскізаў. Распрацоўваецца мноства варыянтаў формаў вырабу скураных бранзалетаў (бранзалетаў-абярэгаў), каб потым выбраць самы аптымальны варыянт. Звяртаючыся да розных крыніц масавай інфармацыі, навучэнцы звярнулі на бранзалетах з фігурным пляценнем на аснове, бо для бранзалетаў-абярэгаў важная тэхніка перапляценняў і завязвання вузельчыкаў.

У дадатак да бранзалета распрацаваецца эскіз шыйнага ўпрыгожвання – грыўны, з тым жа фігурным пляценнем.

Сучасны погляд і вялікая цікавасць да ўпрыгожванняў са скуры заахвоціў нас стварэнне эскізаў на камплекты жаночых упрыгожванняў з ужываннем тэхнік “у абцяжку” і “філігрань” (таксама старадаўніх, але асучасненых тэхнік). Дзякуючы фантазіі пад час працы над эскізамі атрымалася цэлая калекцыя камплектаў упрыгоджванняў .

Кампазіцыя – пабудова мастацкага твора, абумоўленая яго зместам, характарам, прызначэннем шмат у чым вызначае яго ўспрыманне.

**2. Выбар скуры як вырабнога матэрыялу.**

Скура, як матэрыял бывае па прызначэнні абутковым і мэблевым, галантарэйным і для вырабу адзення. Калі класіфікаваць па таўшчыні, то скура бывае тоўстая і тонкая. З пакрыццём і без пакрыцця. Таму перш, чым прыступіць да стварэння вырабу са скуры, важна вызначыць, што ў выніку павінна атрымацца, і, зыходзячы з гэтага, ацаніць памеры, колер, якасць і структуру матэрыялу.

Для нарыхтоўкі верха бранзалета з ужываннем тэхнік “перфарацыя” і “фігурная пляцёнка” лепш выбраць абутковую скуру, выробленую са скур буйной рагатай жывёлы, гладкую (з натуральнай вонкавай паверхняй), пераважна расліннага дублення, натуральную (бэжава-карычневых адценняў і чырвонага колеру), сярэдняй таўшчыні. Для нарыхтоўкі нізу (падшэўкі) і палоскі-шнурка варта выбраць тонкую скуру са скур коз (шаўро ці казлінка).



*Малюнак 9.*

Для бранзалетаў і іншай біжутэрыі, што будзе выконвацца ў тэхніках “у абцяжку” і “філігрань”, трэба абраць тонкую скуру са скур коз (шаўро і казлінку). Праца з больш тонкай скурай лягчэй і дазваляе атрымаць больш вытанчаныя вырабы жаночых упрыгожванняў (мал.9).

Матэрыялам можа служыць і скураны лапік (абрэзкі пасля выкройвання дэталяў абутку на абутковых і галантарэйных прадпрыемствах).

Скураны лапік павінен быць роўны, без зморшчын. Калі ёсць нейкія заганы (дзірачкі, парэзы і інш.), то пры разметцы дэталяў іх трэба “абыйсці”.

**3. Інструменты і матэрыялы. Арганізацыя працоўнага месца.**

Для вырабу скуранога бранзалета спатрэбяцца прылады і прыстасаванні, з якімі трэба пазнаёміцца і авалодаць прыёмамі працы з імі.

Прылады і прыстасаванні: лінейка, кутнік, ручка з сінім стрыжнем, нажніцы, кіянка, мыслік (дыяметр 2.5 – 3.0 мм), падкладная дошка з тоўстай гумы або драўляная калодка (дыяметрам 100х300 мм), клей ПВА і М, пэндзлік.



Матэрыялы для выраба бранзалета: скура 1,5х30х40 мм і 1,5х30 х160 мм;1х150х200мм.



Працоўнае месца заўсёды павінна быць чыстым, патрэбны інструмент размяшчаецца з правага боку, а ўсё астатняе акуратна складваецца ў іншым месцы.

**4. Выраб скуранога бранзалета, упрыгожванняў са скуры.** Пачынаецца праца з падрыхтоўкі дэталей бранзалета. Трэба вымераць загатоўкі і выразаць: накладка з шчыльнай скуры 30х40 – 1шт., палоска з тонкай скуры 4х200 – 1 шт., аснова з шчыльнай скуры 30х160 – 1 шт., палоскі з мяккай скуры 5х600 – 2 шт., падкладка пад асновуз мяккай скуры 30х160 – 1 шт., засцёжказ а мяккай скуры 15х701– 1шт.(мал.10).

Выкарыстоўваючы шаблон, ручку і нажніцы размясціць накладку з шчыльнай скуры 30х40 і палоску з тонкай скуры 4х200 і выразаць іх (мал.10).

**5. Перфарацыя**.

Скураную аснову пад пляценне падрыхтоўваюць з ужываннем тэхнікі “перфарацыя”. Перфарацыя скуры ўяўляе сабой высяканне адтулін на скуры з дапамогай мыслікаў з адтулінамі. Спачатку на скуры робяць разметку (мал.11), пасля змяшчаюць вертыкальна мыслік і моцна ўдараюць малатком (сталярным або драўлянай кіянкай).
З дапамогай прабойніка, кіянкі і падкладной дошкі трэба зрабіць адтуліны на накладке (мал.12). Пад матэрыял падкладваюць падкладную дошку ў выглядзе цвёрдага гумовага ліста ці драўлянай калодкі. Прабойнікі павінны быць добра заточаныя, тады і адтуліны будуць з роўным краем.



Малюнак 11.



Малюнак 12.

Высякаюць адтуліны на дэталях накладкі і асновы па разметцы, выкананай па схеме (Мал.13).



Малюнак 13.

**6. Фігурная пляцёнка.**

Для выканання плоскага пляцення на аснове ў тэхніцы “фігурнай пляцёнкі” аснова павінна быць ужо з адтулінамі. Пляценне выконваецца вузкай скураной палоскай (3-5 мм), даўжыня палоскі ў 6-8 разоў больш даўжыні асновы. Канцы палоскі (10 мм) змазваюць клеем, згінаюць уздоўж і зразаюць па касой. Гэта робяць для таго, каб было лягчэй працягваць палоску праз адтуліны. Доўгую палоску выразаюць з кавалачка скуры ў форме кола па спіралі, затым трохі змочваюць, асцярожна пацягваюць і накручваюць на цыліндрычную форму (слоічак і да т.п.) для выпроствання.

Спачатку пляцення палоску працягваюць з адваротнага боку (бок з ворсам) на вонкавы бок (бок гладкі) амаль цалкам, пакідаючы кончык 10 мм, яго падляпляюць да адваротнага боку клеем. Пляценне заканчваюць на адваротным баку дэталі, адразаюць лішнюю даўжыню палоскі, пакідаючы кончык таксама 10 мм і падляпляюць.

Пляценне накладкі выконваюць па схеме № 1.



*Схема № 1*

Пляценне асновы бранзалета выконваюць па схеме № 2.



*Схема 2*

Таксама трэба выканаць пляценне “фігуная пляцёнка” па схеме з іншага боку. Прыклеіць падкладку дэталей і выканаць засцёжку.Завязать вузельчыкі на канцах палос. Выканаць апрацоўку вырабу. Пракантраляваць якасць вырабу.

**7. Прэзентацыя праекта**

Навучэнцы аб’яднання па інтарэсах на працягу рэалізацыі праекта займаліся падрыхтоўкай відэапрэзентацыі, якая была прадстаўлена падчас выніковага этапу праекта.

*Вынікі праекта прэдстаўлены ў відэароліку*

**Заключэнне**

Скураныя бранзалеты, як упрыгожванні для дзяўчат, могуць стаць маленькім творам мастацтва. Мастацкая апрацоўка скуры дае вялікую магчымасць для фантазіі. Апраўданыя дэталі падкрэсліваюць дэкаратыўныя, характэрныя элементы абярэга. Гэтыя ж элементы, што паўтараюцца і на грыўні, завушніцах, выкананыя ў адным стылі, утвараюць камплект упрыгожванняў. Упрыгожванне павінна прыцягваць прыгожай формай, лаканічнымі лініямі, высокай якасцю выканання.

Усё гэта разам дазваляе гэтаму вырабу быць упрыгожваннем для адзення. Упрыгожванне, абярэг, рытуальны атрыбут, сродак навучання, адраджэнне рамяства – усе гэтыя значэнні спляліся разам, у адну самую галоўную функцыю: духоўны кантакт.

Вырабленыя камплекты ўпрыгожванняў можна выкарастоўваць як асобныя, самастойныя ўпрыгожанні, так і ў выглядзе калекцыі для экспанавання на выставах.

**Спіс выкарастанных крыніц**


1. Боганева, А.М. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў / А.М.Боганева і др. – Мінск : Беларуская навука, 2004.
2. Браиловская, Л.В. Арт – дизайн: красивые вещи ”handmade“/ Л.В. Браиловская. – Ростов н/Д.:”Феникс“. –2006.
3. Горяинова, О.В. Школа юного дизайнера / О.В. Горяинова. –Рустов н/Д.: ”Феникс“. – 2005.
4. Голубинцева, Е. ”Подарки из кожи: украшения и аксессуары“/ Е.Голубинцева. – Санкт-Петербург. – 2004.
5. Лихонин, А. С. Скорняжные и кожевенные работы / А.С. Лихонин–Н.Новгород : Времена. – 2000.
6. Миронова, Л.Н. Цвет в изобразительном искусстве: пособие для учителей Л.Н. Миронова. – Мн.: Беларусь. – 2002.
7. Пушкина, В.З. Кожа: практическое руководство/ В.З. Пушкина. – И.: Изд-во ”Эксмо“. – 2003.
8. Селиванова, Т.А. Изделия из кожи: панно, сувениры, украшения / Т.А. Селиванова. – М.: ИД МСП. – 2000.–123с.
9. Столярова, С.И. Изделия из кожи: Методические рекомендации / С.И. Столярова. – Витебск: Гос. ун-т, 1992.
10. Рязанская, М. И., Вигдорович Ф. Л. Маленькая домашняя энциклопедия / М.И. Рязанская. – М.– 1990.
11. Уткин, П. И. Народные художественные промыслы: учеб. для проф. учеб. Заведений / П.И. Уткин. – М.: Высш. шк. 1992. – 159с.
12. Филиппова, С.Н. Изделие из кожи / С.Н.Филиппова. – М.: ООО ”Изд-во АСТ“, Донецк ”Сталкер“.– 2003.
13. Шахова, Н.В. Кожаная пластика/ Н.В. Шахова – М.: ООО ”Изд-во АСТ“, Донецк ”Сталкер“.– 2003.– 89с.
14. Шахова, Н.В. Сувениры из кожи: знаки зодиака, животные - символы восточного гороскопа / Н.В. Шахова. – М.: ЗАО ”Бао-пресс“, ООО ”ИД“ Рипол Классик.–2006.

## ДАДАТАК 1. КАЛЕКЦЫЯ ЎПРЫГОЖВАННЯЎ



Малюнак 1. "Дарына". Яўгенія Яскевіч. Тэнікі: філігрань, кропкавы роспіс, у абцяжку.



Малюнак 2. "Красаліна". Ангеліна Ганчарэнка. Тэхнікі: філігрань, кропкавы роспіс, у абцяжку



Малюнак 3. "Яраміла". Вераніка Карповіч. Технікі: у абцяжку, філігрань



Малюнак 4. "Міліца". Мар'яна Мельяноўская. Тэнікі: у абцяжку, філігрань.

## ДАДАТАК 2. МЕТАДЫЧНАЯ РАСПРАЦОЎКА ЗАНЯТКА

**Тэма занятка:** Бранзалет.

**Мэта:** стварэнне арганізацыйных і навучальных умоў для вытворчасці сувенірнага вырабу.

**Задачы:**

замацаваць уменіі і навыкі навучэнцаў па прыёмах "фігурная пляцёнка" і "перфарацыя" на прыкладзе вырабу "бранзалет";

садзейнічаць развіццю памяці, увагі;

садзейнічаць выхаванню культуры працы;

**Матэрыяльна-тэхнічнае забяспячэнне:** узоры і фатаздымкі гатовых вырабаў с прымяненнем прыёмаў "фігурная пляцёнка" і "перфарацыя"; тэхналагічная карта з узорам бранзалета ў этапах вытворчасці; структурна-лагічная схема або парадак выканання; наборы дэталей для выканання практыкаванняў; памятка па ТБ пры працы з прабойнікам і кіянкай; інструменты і абсталяванне: нажніцы, ручка, пэндзлік, прабойнік, кіянка, зруб драўляны.

Матэрыялы: натуральная скура, лякала, клей ПВА, скураныя шнуркі (55-60 см. і 12-15 см.).

**Ход занятка**

1. **Арганізацыйны момат.**

***Практыкаванне на стварэнне станоўчай атмасферы на занятках***

**Педагог.** Прапаную даведацца, у якім настроі і з якімі думкамі вы сення прыйшлі. Для гэтага мы выкарыстоўваем такі прыём, як "Памяняемся месцамі".

- Ітак, мяняемся месцамі тыя, хто…

прыйшоў на занякі ў галаўных уборах;

у каго абутак чорнага колеру;

у каго ў адзенні ёсць чырвоны колер;

у каго зараз добры настрой;

хто падрыхтаваў рабочае месца да пачатку заняткаў.

***Аб'яўленне тэмы і задач заняткаў***

**Педагог.** Тэмай заняткаў сення стане вытворчасць бранзалета, на прыкладзе якога мы замацуем вашы ўменні і навыкі па раней засвоеным прыёмам дэкаратыўнай апрацоўкі скуры.

2. **Асноўная частка.**

***Паўтарэнне продзенага матэрыялу***

**Педагог.** Паглядзіце на ўзор гатовага вырабу. Перш чым прыступіць да працы, вызначым, якія прыёмы дэкаратыўнай апрацоўкі скуры неабходна прымяніць для выканання бранзалета.

– Давайце паўторым на трынажоры прыём “фігурнае пляценне”. (выходзяць жадаючыя і паказваюць выкананне прыёма).

***Выкладанне новага матэрыялу***

**Педагог.** Для выканання бранзалета нам спатрэбіцца: натуральная скура, лекала клей ПВА; скураныя шнуркі (55-60 см. і 12-15 см.), ручкі, нажніцы, лінейка, прабойнік, кіянка, зруб, тэхналагічная карта з этапамі выканання вырабу “бранзалет”.

***Паўтарэнне правіл тэхнікі бясбекі пры рабоце з прабойнікам і кіянкай***

***Практычная работа.***

Перад пачаткам выканання работы неабходна раздзяліцца на 3 групы, у кожнай з іх вызначаецца лідэр. Педагог сочыць за зладжанай працай у групе. тлумачыць ход выканання работы, групы выконваюць дадзеныя заданні. Тая група, якая справілася першай, аказвае дапамогу іншым групам або выконвае яшчэ адзін варыянт бранзалета.

*Фізкультхвілінка*

Птушкі ў вырай адлятаюць (махавыя рухі рукамі з-за галавы наперад)
Гусі, гракі, журавы (кругавыя рухі кісцямі рук перад грудзьмі)
Вось ужо апошняя зграя
Крыламі махае ў далічыні (рухі рукамі імітуючы рух крылаў)

***Парадак выканання бранзалета:***

*Этап перфарацыіі*

1. Абвядзіце лякала 1 на скуры і выражце дэталь 1 – аснову.
2. Начарціце лініі ўздоўж краёў палоскі, адступаючы ад краю на 3-5 мм.
3. Адзначце на адной лініі кропкі з крокам 1 см.
4. Перанясіце кропкі на другую лінію так, каб ніжнія кропкі былі дакладна пад верхнімі.
5. Прабейце аддтуліны з дапамогай прабойніка так, каб адтуліны не заходзілі за лінію.

*Этап пляцення*

1. Складзіце шнурок напалову і пазначце сярэдзіну.
2. Працягніце абодвы канцы шнурка ў першую пару адтулін (з адваротнага боку на вонкавы).
3. Размясціце крыжыкам абодва канца палоскі і выведзіце іх на адваротны бок праз 3-ю пару адтулін.
4. Падніміцеся ўверх да 2-й пары адтулін і выведзіце канцы шнурка на вонкавы бок.
5. Размясціце крыжыкам абодва канца палоскі і выведзіце іх на адваротны бок праз 4-ю пару адтулін.
6. Падніміцеся ўверх да 3-й пары адтулін і выведзіце канцы шнурка на вонкавы бок.
7. Працягвайце пляценне на аснове і падклейце кончыкі.

*Этапы вытворчасці зашпількі*

1. Працягніце другі шнурок праз пары крайных адтулін.

2. Абвядзіце лекала 2 на скуры і выражце тры дэталі пад № 2 – гэта зашпілька.

3. Прыклейце дзве дэталі на кончыкі шнурка.

4. Змажце клеем і скруціце дэталі № 2.

5. Прыклейце адну дэталь № 2 на сярэдзіну двух палос шнурка, нанясіце клей на кончык.

6. Сцягніце і пашырце бранзалет за кошт зашпількі.

7. Выканайце канчатковае аздабленне.

**3. Замацаванне пройдзенага матэрыялу**

***Практыкаванне "Разметка адтулін"***

Выканайце разметку для адтулін з дапамогай лінейкі. На палосцы з кардону (15 х 3 см) правядзіце лінію ад края (0.3 – 0.5 см.) і адкладзіце на ей кропкі праз 1 см., панумаруйце іх. Правядзіце другую лінію над першай, перанясіце на яе гэтыя кропкі. Між кропкамі абазначце кружочкі(мал.1).



Малюнак SEQ Малюн

***Практыкаванне "Высечка адтулін"***

Узяць ручку левай рукой так, каб мізінец быў на 1 см. вышэй за кончык стрыжня і паставіць на 1-ю кропку верхняй лініі. Далонь пры гэтым трымаць гарызантальна. Затым паставіць на 1-ю ніжняй лініі. Далей на 2-я, 3-я пары і так да канца(мал.2).



Малюнак 2

***Практыкаванне "Замочак"***

Узяць шнурок і скласці яго напалову. Пасярэдіне складзеных канцоў шнурка плотна закруціць вузкі трохкутнік і кончык яго прыклеіць. Праверыць работу замочка, двігаючы яго ўздоўж шнурка.

*(выкананне практыкаванняў)*

**3. Падвядзенне вынікаў**

***Ацэнка працы групы па наступным крытэрыям:*** дакладнасць выканання прыёма; акуратнасць; з'яднанасць групы ў на працягу выканання задання.

***Выніковыя пытанні па тэме:***

− Якія прыёмы дэкаратыўнай апрацоўкі скуры вы выкарасталі для вытворчасці бранзалета?

− Як правільна трымаць прабойнік?

− Як правільна выканаць зашпільку для бранзалета, каб яна была "працоўнай"?

***Рэфлексія. Прыём "Ланцужок пажаданняў"***

Кожнаму ўдзельніку па ланцужку прапаноўваецца звярнуцца з пажаданнямі да сябе і да таварыша па групе. Пажаданні могуць быць накіраваны на будучыя справы. Заканчвае ланцужок педагог, падводзячы пэўны вынік.

Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Цэнтр дзяцей і моладзі Глыбоцкага раёна”

# ПОШУКАВА-ДАСЛЕДЧЫ ПРАЕКТ “ТРАДЫЦЫІ Ў БУДУЧЫНЮ”

*Шпакава Аксана Андрэеўна, педагог дадатковай адукацыі ўзорнага тэатра моды “Аліса”*

## Уводзіны

Адным з прыярытэтных напрамкаў развіцця Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе з’яўляецца выхаванне маладога пакалення на традыцыйных каштоўнасцях беларускага народа. Менавіта ў іх сканцэнтравана, замацавана і перадаецца з пакалення ў пакаленне ўсё тое, што было сабрана народам за ўсю гісторыю яго існавання. Велізарную нішу сярод традыцыйных каштоўнасцяў беларускага народа займае народная дэкаратыўна-прыкладная творчасць, якая з’яўляецца асновай любой нацыянальнай культуры. Творы дэкаратыўна-прыкладной творчасці, выкананыя ў нацыянальных традыцыях, як сведчанне невычэрпнага таленту чалавека, якія сыходзяць каранямі ў шматвяковую гісторыю свету з'яўляюцца невычэрпнай крыніцай для фарміравання і рэалізацыі творчага пачатку дзяцей і падлеткаў, іх духоўнага і маральнага выхавання, якія дазваляюць пазнаваць гісторыю сваёй малой радзімы,культуру і традыцыі.

Глыбоцкая зямля мае багатую духоўную спадчыну. Нягледзячы на разбуральныя войны, стыхійныя бедствы жыхары Глыбоччыны памнажалі і захоўвалі яе на працягу стагоддзяў . Так, сапраўдным здабыткам глыбачан можна назваць маляванкі Язэпа Драздовіча, якія з’яўляюцца  прыкладам твораў дэкаратыўна-прыкладной творчасці беларускага народа. Пра творчасць Язэпа Драздовіча, таленавітага земляка Глыбоччыны напісана дзясяткі дакументальных кніг і артыкулаў, знята мноства кінастужак. Маляваныя дываны Язэпа Драздовіча з’яўляюцца на сённяшні дзень каштоўнымі экспанатамі музеяў і музейных пакояў не толькі на Глыбоччыне, але і па ўсёй Беларусі. Маляваныя дываны Язэпа Драздовіча – цяпер гісторыка-культурная нематэрыяльная каштоўнасць Беларусі.

Падрастаючае пакаленне Глыбоччыны ганарыцца сваім таленавітым земляком і таму вялікую ўвагу надае знаёмству і папулярызацыі яго творчасці. Так, навучэнцы аб'яднання па інтарэсах узорны тэатр моды “Аліса” вядуць мэтанакіраваную работу ў гэтым напрамку праз праектную дзейнасць, вынікам якой стаў праект “Традыцыі ў будучыню”. Дадзены

праект-як працяг праекта “Родныя вобразы”, які распрацавалі некалькі год назад старэйшыя навучэнцы.Па выніках яго была выраблена сцэнічная калекцыя адзення з маляванкамі Драздовіча і мела вялікі поспех на выступленнях. Навізна цяперашняга праекта ў тым, што вывучыўшы жыццёвы шлях і творчыя здольнасці Язэпа Драздовіча, мы вырабім сучасную калекцыю адзення для моладзі “Глыбоцкі стыль” з элементамі маляванак таленавітага земляка.

**Пашпарт праекта**

**Назва праекта :** “Традыцыі ў будучыню”.

**Мэта:** фарміраванне ў навучэнцаў каштоўнаснага стаўлення да сваёй малой радзімы і пачуцця гонару за яе культурную спадчыну праз знаёмства з творчасцю Язэпа Драздовіча.

**Задачы:**

- знаёмства з навуковай літаратурай па тэме даследавання;
- аналіз інфармацыі на інтэрнэт-сайтах па тэме даследавання;
- знаёмства і абагульненне матэрыялаў аб творчасці Язэпа Драздовіча;
- знаёмства з творчасцю С. А.Скавырка-сучасным народным майстрам маляванак Беларусі на Глыбоччыне;
- адраджэнне і папулярызацыя мастацтва маляванкі ў дзіцячай творчасці;
- выраб калекцыі сучаснага маладзёжнага адзення “Глыбоцкі стыль” з элементамі маляванак з мэтай папулярызацыі творчасці Язэпа Драздовіча;
- развіццё мастацкіх здольнасцей і творчай актыўнасці вучняў;
- выхаванне патрыятызму і грамадзянскай пазіцыі, заснаванай на любові да сваёй радзімы, народа, павазе да нацыянальнай культуры;
- выхаванне эстэтычнага густу, запатрабаванні ў самавыяўленні.

**Тып праекта:** інтэграваны,пашукава-даследчы.

**Удзельнікі праекта:** навучэнцы ўзорнага тэатра моды “Аліса”.

**Адукацыйная вобласць:** народная дэкаратыўна-прыкладная творчасць:традыцыі і сучаснасць.

**Форма прадстаўлення вынікаў вопыту:** мультымедыйная прэзентацыя, прэзентацыя калекцыі, відэаролік, круглы стол, выступленні, удзел у конкурсах і мерапрыемствах.

**Метады, выкарыстаныя ў праекце:**

пошукавы(работа з друкаванымі і электроннымі крыніцамі інфармацыі); практычны (выраб калекцыі сучаснага адзення для моладзі “Глыбоцкі стыль”)

даследчы (работа ў музеях,бібліятэках,бяседы з жыхарамі).

**Тэрмін рэалізацыі праекту:** студзень -снежань 2021 года.

**Этапы рэалізацыі праекта**

| Этапы | Тэрміны рэалізацыі | Змест |
|---|---|---|
| Арганізацыйна-матывацыйны этап | Студзень 2021г. | Адкрыццё праекта “Традыцыі ў будучыню”. |
| Інфармацыйна –даследчы этап | Студзень-май 2021г. | Наведванне школьных бібліятэк горада. Размовы з супрацоўнікамі бібліятэк. Работа з дакументальнай літаратурай аб жыцці і дзейнасці Язэпа Драздовіча.<br>Наведванне раённай бібліятэкі і знаёмства з архіўнымі матэрыяламі аб жыцці і творчасці Язэпа Драздовіча.<br>Віртуальная экскурсія па школьных музеях Глыбоччыны.( Музей УА “Падсвільская СШ імя П.М.Казлова”, УА “Празароцкая СШ імя І.Т.Буйніцкага”.<br>Пашукова-даследчая работа па творчасці Язэпа Драздовіча. Сустрэчы і размовы з меснымі жыхарамі, сведкамі сустрэч з Я.Драздовічам. Работа з інтэрнэт-рэсурсамі па тэме праекта.<br>Знаёмства з сучаснымі майстрамі маляванкі на Беларусі.<br>Экскурсія ў Дом рамёстваў. Удзел у віктарыне “Мінулае роднага краю”.<br>Знаёмства з творчасцю С.А.Скавырка -сучасным майстрам маляванкі з Глыбокага.<br>Творчая вечар-сустрэча з народным майстрам па маляванцы С.А.Скавырка.<br>Майстар-клас па вырабу маляванкі са С.А.Скавырка.Конкурс творчых работ па маляванцы сярод гурткоўцаў “Маляваныя цуды”.<br>Экскурсія ў гісторыка-этнаграфічны музей г.Глыбокае.<br>Прагляд відэафільма “ Імя і лёс. Язэп Драздовіч” з наступным абмеркаваннем. |
| Практычны | Май-кастрычнік 2021г. | Сустрэча з сучаснымі дызайнерамі адзення.<br>Работа з інтэрнэт –рэсурсамі на тэму сучаснага моладзевага адзення.<br>Распрацоўка эскізаў мадэляў да калекцыі. |

| | | |
|---|---|---|
| | | Конкурс эскізаў мадэляў з элементамі маляванкі.<br>Творчая работа па вырабу калекцыі “Глыбоцкі стыль”.Раскрой і пашыў калекцыі “Глыбоцкі стыль”.<br>Конкурс на лепшую распрацоўку лагатыпу праекта. |
| Заключны | Кастрычнік-снежань 2021г. | Прэзентацыя праекта на метадычным савеце ў Цэнтры дзяцей і моладзі.<br>Дэманстрацыя калекцыі “Глыбоцкі стыль” на раённым свяце Дзень маці.<br>Закрыццё праекта “Традыцыі ў будучыню”. Падвядзенне вынікаў работы.<br>Прэзентацыя праекта ў раённых, абласных, рэспубліканскіх конкурсах. |



*Калекцыя “Родныя вобразы”. Дзень моладзі на Міжнародным фестывалі мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску”*







*Калекцыя “Родныя вобразы”.Адкрыццё выставы па маляванцы ў Віцебскім метадычным цэнтры народнага мастацтва.*

*Дэманстрацыя калекцыі “Родныя вобразы” і праекта на Міжнароднай канферэнцыі ў межах “Вішнёвага фестывалю ў Глыбокім”*

*Моманты выступлення на фесты*
*“Абдымі мяне,матуля”,Дагда,Лат*

## Змест і механізмы рэалізацыі праекта

Праект "Традыцыі ў будучыню" распрацаваны гурткоўцамі ўзорнага тэатра моды "Аліса".Уся работа ў праекце падзяляецца на чатыры этапы: арганізацыйна-матывацыйны, падрыхтоўча-арганізацыйны, практычны і заключны. Кожны этап праекта ўзаемазвязаны паміж сабой, што дазваляе планамерна дасягаць яго мэты. На працягу ўсяго праекта праводзіцца пошукава-даследчая работа па знаёмству з творчасцю Язэпа Драздовіча, які шмат часу жыў і працаваў на Глыбоччыне, маляваў свае знакамітыя па ўсім свеце дываны. Вынікам праекта стане не толькі знаёмства з творчасцю знакамітага земляка, але і выраб сучаснай калекцыі адзення для моладзі "Глыбоцкі стыль" з элементамі маляванак, такім чынам зрабіць свой маленькі ўнёсак у сучасную моду, бо да сёняшняга часу такіх калекцый адзення не існавала.

*Арганізацыйна-матывацыйны этап* праекта прадугледжвае адкрыццё праекта, а галоўнай мэтай з'яўляецца знаёмства ўдзельнікаў паміж сабой, знаёмства з мэтай і задачамі, планам далейшай работы. Падчас адкрыцця праекта праводзіцца прэзентацыя праекта "Родныя вобразы", рэалізаванага раней навучэнцамі старэйшай групы ўзорнага тэатра моды "Аліса", па выніках якога была выканана калекцыя адзення з адлюстраваннем малюнкаў самаго Драздовіча. Калекцыя мела вялікі поспех на розных мерапрыемствах не толькі ў горадзе, але і на абласных, рэспубліканскіх і міжнародных святах, а веды, атрыманыя навучэнцамі падчас пошукава даследчай дзейнасці былі дастойна прадстаўлены на раённых і абласных канферэнцыях. Дадзеная работа будзе удасканалена праз новы праект "Традыцыі ў будучыню".

*Інфармацыйна-даследчы этап праекта* пачынаецца з наведвання навучэнцамі школьных і гарадской бібліятэк, Глыбоцкага Дома рамёстваў, гарадскога Цэнтра культуры, Глыбоцкага гісторыка-этнаграфічнага музея, музея ДУА "Падсвільская сярэдняя школа імя П.М.Казлова" –кладзезя цікавейшай інфармацыі аб творчасці таленавітага земляка Язэпа Драздовіча. На дадзеным этапе шмат увагі надаецца збору і апрацоўцы архіўных матэрыялаў, дакументальнай і мастацкай літаратуры, яе сістэматызацыі. Работа з інтэрнэт-рэсурсамі па тэме праекта дазволіць дапоўніць і зрабіць інфармацыю больш разнастайнай.

Падчас экскурсіі ў раённы Дом рамёстваў сталі ўдзельнікамі віктарыны "Мінулае роднага краю", "Глыбоцкія майстры –умельцы". Адказваючы на пытанні віктарын, пазналі і адкрылі шмат цікавых старонак з гісторыі сваёй малой радзімы, у тым ліку пра жыццё і творчасць Язэпа Драздовіча.
Вельмі пазнавальнымі сталі экскурсіі ў гісторыка-этнаграфічны музей горада Глыбокае, школьны музей ў Падсвіллі, дзе па сённяшні час захоўваюцца дываны, намаляваныя Язэпам Драздовічам. Супрацоўнікі Глыбоцкага

гісторыка-этнаграфічнага музея распавядалі нам, якім памятаюць Драздовіча на Глыбоччыне - малой радзіме творцы.



Малюнак Я.Драздовіча. Засценак Пунькі



Даведаліся,што засценак Пунькі-месца нараджання Я.Драздовіча. Засценкам раней называлі паселішча накшталт хутара, якое здавалася ў арэнду дробнай шляхце. Да такіх збяднелых шляхцічаў належаў і бацька Драздовіча. Калі нарадзіўся Язэп, сям’я арэндавала Пунькі за 30 кіламетраў ад Глыбокага, побач з пасёлкам Падсвілле.Сёння ад засценка, які намаляваў Драздовіч, нічога не засталося.Толькі па старому дубу і калодзежнай яме можна зразумець, дзе раней стаяла хата. Яшчэ ў суседняй вёсцы Падсвілле захоўваецца падцверджанне таго, што Драздовіч нарадзіўся менавіта ў гэтым месцы.У школьным музеі ў Падсвіллі ёсць шыльда, дзе напісана «Пунькі на Галубіцкай пушчы, нарадзіўся ў 1888 г. Язэп Нарцысавіч Драздовіч» мастак сам напісаў за некалькі гадоў да смерці і падараваў тагачаснаму ўладальніку засценка. Хлопчыку споўнілася два, калі памёр яго бацька. Маці засталася адна з шасцю дзецьмі. З гэтага часу і пачалося бясконцае вандраванне Драздовіча па жыцці, бо сям’я не раз мяняла хаты ў ваколіцах Галубіцкай пушчы.




Шыльда,якую сам напісаў і падараваў ўладальніку засценкаЯ.Драздовіч

Драздовіч скончыў Віленскую школу малявання, жыў у Вільні, Навагрудку, Мінску, але заўсёды вяртаўся на Дзісеншчыну. Працаваў недалёка ад вёскі Германавічы (Шаркаўшчынскі раён), дзе сёння таксама ёсць прысвечаны яму музей. Там стварыў народную бібліятэку, аматарскі тэатр.

У Глыбокім выкладаў маляванне, зараз Глыбоцкая мастацкая школа носіць яго імя. Пракрочыўшы тысячы кіламетраў, убачыўшы сотні гарадоў і мястэчак, у 1935 годзе, калі яму ўжо споўнілася 47 гадоў, ён у каторы раз вярнуўся на родную Дзісеншчыну, дзе ізноў шмат маляваў і дараваў настрой простаму люду,які памятае Драздовіча і па сёняшні час.

Трэба адзначыць, што вялікая ўвага ў праекце “Традыцыі ў будучыню” надалі



працы з сям'ёй. Бо, дзе, як не ў бабуль і дзядуль захаваліся маляваныя дываны тых часоў. Асабліва бабулі заўсёды трымаюць у памяці свае незабыўныя гады дзяцінства, а разам з імі ўспаміны сваіх продкаў якія, нават сустракаліся з Язэпам Драздовічам, назіралі за яго маляваннем. Менавіта яны шмат чаго могуць паведаміць нам пра гісторыю касцюма. Вось на такіх успамінах і матэрыялах

паявіўся ў Падсвільскай школе музей,прысвечаны Язэпу Драздовічу распачаў працу ў пачатку 1990-ых гадоў. Пабываўшы ў музеі даведаліся, што збіраць звесткі пра Драздовіча было няцяжка: мастака ўсе ведалі. Ён стала жыў на Дзісеншчыне з 1930-х да самай смерці ў 1954-м. Гэта быў нялёгкі пэрыяд у жыцці Язэпа. Ён не мог знайсці працу, не меў дома, таму хадзіў ад вёскі да вёскі і прапаноўваў намаляваць карціны і дываны, часцей за ўсё за ежу і прытулак,-успамінаюць жыхары.У памяць аб ім школьным музеі Падсвілля захоўваюцца чатыры дываны і дзве карціны Драздовіча.

Маляваныя дываны Я.Драздовіча ў музеі Падсвільскай школы.



Кожная нявеста мела ў пасаг маляваны кавёр Драздовіча

Мясцовыя жыхары ўзгадвалі Драздовіча высокім, статным, з доўгай барадой. Ён сярод усіх выдзяляўся як сапраўдны шляхціч. Хадзіў з кіем, у вышытай кашулі, паліто ды з такой драўлянай збітай скрыняй для карцін ці торбай.

Месны жыхар Мар'ян Місевіч, які жыў у Ліплянах каля Падсвілля і шасцігадовым хлопчыкам сустаракаўся з Драздовічам распавядаў, што гэта ўжо зараз гаворым пра яго з захапленнем. Пры жыцці яго ўсе лічылі дзіваком. Ён мог з ручайком паразмаўляць, стаяў падоўгу ды на дрэвы глядзеў, як быццам выглядаў што.



− Нас Драздовічам часам нават пужалі, гаварылі, што прыйдзе і забярэ ў сваю торбу. Ён, відаць, як скончыў карціну для суседа, далей пайшоў і па дарозе нам у вакно пагрукаў. А мы з братам былі адны. Як убачылі ў вакне высокага барадатага мужчыну, закрычалі і схаваліся пад ложак, — смяецца Мар'ян.

Асноўным заробкам Драздовіча ў апошнія гады жыцця былі дываны, малюнкі на тканіне, якія вешалі на сцяну, звычайна каля ложка. Такія ўпрыгожванні сталі папулярнымі ў Віцебскай вобласці. Нават мода была, каб кожная нявеста мела ў пасаг хоць адзін дыванок.

Драздовіч значна больш любіў карціны, працу з дыванамі ён лічыў надакучлівай, хоць і займаўся ёй гадамі. У дзённіку, які знаходзіцца ў музеі, прачыталі пра дываны: «… Людзям даю. Хай набіраюцца густу да прыгожага. Хай узгадоўваюць у сабе пачуццё эстэтыкі”.



Творчасцю Язэпа Драздовіча актыўна зацікавіліся прыкладна праз 25 гадоў пасля яго смерці. Многія яго знаёмыя з Дзісеншчыны напісалі артыкулы і ўспаміны, якія ўвайшлі ў вялізную кнігу Міхася Казлоўскага «Язэп Драздовіч. Праз церніі да зорак». У 1982 годзе на магіле мастака з’явіўся помнік,а ў гісторыка-этнаграфічным музеі Глыбокага ёсць невялічкая экспазіцыя, прысвечаная Глыбокаму, і бюст мастака на Алеі землякоў.



Помнік Я.Драздовічу

У музеі прапанавалі прагляд дакументальнага фільма пра жыццё і лёс Я.Драздовіча.

*“Жыццё і творчасць Язэпа Драздовіча*

*У інфармацыйна-даследчы этап* праекта уключана знаёмства з сучаснымі майстрамі маляванкі, сярод якіх С.А.Скавырка – народны майстар Глыбоччыны. Пазнаёміўшыся з яе творчасцю, зрабілі вывад,што ў работах



майстра гарманічна пераплятаюцца прыгожыя суквецці,цікавыя мясціны краю,сілуэты дзікіх жывёл, птушак. Яе маляванкі называюць брэндам Глыбоччыны і лічаць нематэрыяльнай каштоўнасцю рэгіёна. Для шматлікіх работ характэрны яркія фарбы і, здавалася б, просты сюжэт, але многія дэталі маюць свой падтэкст, сімвалічнае значэнне, якое раскрывае непаўторную прыгажосць азёрнага краю. Сваімі працамі С.А.Скавырка расказвае, што маляванкі вельмі натуральна ўпісваюцца ў нашу эпоху - гэтыя цудоўныя ўзоры «па-за часам”.








*Маляваныя дываны С.А.Скавырка*

*Маляваныя дываны С.А.Скавырка – народнага майстра Глыбоччыны*



С.А.Скавырка правяла майстар-клас па тэхніцы маляванкі і пазнаёміла навучэнцаў з асноўнымі прыёмамі малявання дываноў.Атрыманыя навыкі і уменні дапамаглі ўдзельнікам у выкананні упрыгожвання калекцыі “Глыбоцкі стыль”.

*“Вучымся маляваць маляванкі”*









Папрысутнічаўшы на майстар – класе па роспісу маляванкі прыдумалі і распрацавалі эскізы і мадэлі адзення з элементамі маляванак,такім чынам распачалі *практычны этап*.









*Эскізы мадэляў да калекцыі “Глыбоцкі стыль”*

Пры дапамозе касцюмера Цэнтра дзяцей і моладзі Рубашка Яўгеніі Міхайлаўны па эскізах пашылі калекцыю адзення “Глыбоцкі стыль” і распрацавалі для яе спецыяльны лагатып.

*Лагатып да калекцыі "Глыбоцкі стыль"*

Такім чынам, па выніках работы з’явілася калекцыя моладзевага адзення “Глыбоцкі стыль”

*На заключным этапе* паводле праведзенай пошукава-даследчай працы правялі міні-канферэнцыю ўдзельнікаў праекта, якія падзяліліся вынікамі праекта з іншымі навучэнцамі Цэнтра дзяцей і моладзі,правялі прэзентацыю на педагагічным савеце ўстановы. Па выніках сабранага матэрыялу з мэтай папулярызацыі творчасці знакамітага земляка педагогам разам з навучэнцамі ў творчай дзейнасці на конкурсах і мерапрыемствах прадэманстравана выробленая калекцыя адзення з элементамі маляванак Язепа Драздовіча.





*Калекцыя “Глыбоцкі стыль” падчас выступлення на конкурсе.*

Закрыццё праекта “Традыцыі ў будучыню” ўяўляла сабой прэзентацыю і вынік пошукава-даследчай і творчай дзейнасці. Добрым завяршэннем праекта стала выступленне тэатра моды «Аліса» з паказам калекцыі адзення “Глыбоцкі стыль”. Выраблены буклеты з інфармацыяй пра праект.

**Вынікі рэалізацыі праекта:**

– знаёмства з творчасцю Язэпа Драздовіча;

– знаёмства з творчасцю С. А.Скавырка-сучасным майстрам маляванак на Глыбоччыне;

– адраджэнне і папулярызацыя мастацтва маляванкі ў дзіцячай творчасці;

– выраб калекцыі сучаснага маладзёжнага адзення з элементамі маляванкі з мэтай папулярызацыі творчасці Язэпа Драздовіча;

– развіццё мастацкіх здольнасцей і творчай актыўнасці вучняў;

– выхаванне патрыятызму і грамадзянскай пазіцыі, заснаванай на любові да сваёй радзімы, народа, павазе да нацыянальнай культуры;
– выхаванне эстэтычнага густу, запатрабаванні ў самавыяўленні.

**Літаратура**

1. Народныя майстры і мастакі Віцебшчыны / калектыў аўт.: Л.У. Вакар [і інш.]. – Віцебск: Вшцебская абласная друкарня, 2011. – 440 с.
2. Починова, Н.В. Белорусская народная декоративная роспись: учеб.пособие / Н.В. Починова. – Минск: Вышэйшая школа, 2005. – 174 с.
3. Сахута, Я.М. Сучаснае мастацтва Беларусі / Я.М. Сахута. – Мінск: Беларусь, 2013. – 255 с.
4. Сахута, Я.М. Народнае мастацтва Беларусі / Я.М. Сахута. – Мінск:БелЭн, 1997. – 287 с.
5. Шауро, Г.Ф. Народное изобразительное искусство Беларуси: пособие для студентов / Г.Ф. Шауро; Мин-во культуры Республики Беларусь,Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск: БГУКИ, 2012. –220 с.
6. Язэп Драздовіч. Славутыя мастакі з Беларусі: навуква-папулярнае выданне / Язэп Драздовіч. – Мінск: Беларусь, 2013. – 96 с.
7. Язэп Драздовіч – асоба, творчасць. Мастацтва – інсітус: матэрыялы навукова-практычных канферэнцый, Мінск, 20-22 мая 1993 г. – Мінск: Беларускі інстытут праблем культуры, 1997. – 88 с.
8. Язэп Драздовіч. Праз церні да зорак: успаміны, артыкулы, прысвячэнні, мастацкія творы / уклад. Міхася Казлоускага. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2014. – 543 с.

**Приложение 1**

## ФАКТОТЕКА
## «БЕЛОРУССКИЕ РАСПИСНЫЕ КОВРЫ (МАЛЯВАНКИ). ИСТОРИЯ ВОЗНИКНОВЕНИЯ»

*Подготовила Вознякова София, учащаяся образцового театра моды «Алиса»*

Белорусские расписные ковры (малеванки) – традиционное белорусское ремесло, вид живописи по холсту, народная роспись. Это рисованные на ткани (бумаге, клеенке) изделия, предназначавшиеся для украшения интерьера дома.

Расписные ковры известны на территории Беларуси с конца XIX века, но наибольшее их распространение произошло в 1930-х — 1950-х годах, когда велась интенсивная застройка деревни, которая требовала соответствующего народному вкусу отделки интерьера. В этой области народной живописи сформировалась собственная поэтика идиллической картины мира с характерными для нее живописно-пластическими метафорами рая. Такие ковры когда-то дарили «на счастье» в белорусских деревнях к свадьбе или к новоселью.

Расписные ковры похожи на вышитые и тканые славянские настенные декоративные ковры по мотивам декора и характеру композиции. Но они были дешевле и менее трудоемкими. На одно изделие шло два сшитых куска домотканого льняного полотна (1,5 x 2 м). Полотнище красили в черный цвет, потом на нем изображали основные детали сюжета, иногда используя трафареты, вырезанные из картона. Прорисовка мелких деталей и светотени выполнялись от руки.

В определенных местах выделились региональные варианты композиции и декора. Отличительные художественные черты имеют расписные изделия Витебской области (Глубокский, Докшицкий, Миорский, Поставский, Шарковщиский районы) и Минской (Мядельский, Вилейский).

Композиция ковров чаще всего представляет расположенный в центре букет цветов в вазе, корзине, или перевитый лентой. Этот центральный рисунок, как правило, имеет растительно-орнаментальное окаймление по краям гирляндой из цветов и листьев, или направленными к центру букетами, рассыпанными по всему полю. Также в композицию включались изображения птиц – ласточек, голубей, павлинов, кукушек, и обычно инициалы автора или заказчика.

Существовали также эконом-варианты ковров: полуковры – из одного полотнища и макатки – из половины полотнища. Этим малым формам были присущи композиции с парами львов, оленей, голубей, выполненных в обычной наивно-реалистической манере.

От ареала происхождения ковров зависела и техника изображения. В Докшицком районе применяли клеевые краски. Поэтому местные расписные ковры отличаются чрезвычайной декоративностью и традиционностью, сильными локальными цветами без полутонов и переходов.

Расписные ковры из других районов Витебского региона выполнены масляными красками. Поэтому они отражают стремление к реализму на них более детально изображены лепестки цветов, листья, очертания животных и птиц.

Обязательным компонентом ковровых пейзажей с Витебщины была водная стихия, что объясняется географическими особенностями природной среды локации формирования этого вида искусства, или изображения историко-культурных памятников региона.

Периодически в Беларуси встречались рисованные ковры сюжетно-тематического характера. В них использовались сюжеты катания на лодках, встречи или прощания влюбленных, архитектурные пейзажи в характерном наивно-реалистическом стиле. Эти сюжеты также были окаймлены орнаментально-растительными мотивами. Примерами этих ковров являются произведения Алены Киш и Язепа Дроздовича. Последователем Дроздовича был самобытный художник Федор Суховила.

Сюжетно-тематические ковры Алены Киш – это совершенно уникальное явление в народном искусстве Беларуси. Расцвет ее творчества пришел на

1930-е годы. Изображения людей, животных и птиц на фоне традиционного или экзотического пейзажа написаны чистыми, звучными красками белого, зеленого, голубого, малинового цветов и обведены черными линиями по контурам. По периметру ковров художник использовала окаймовку с сочными цветочными гирляндами.

В 1980-х годах на Случчине и Витебской области начали возрождать традиции расписных ковров. Благодаря усилиям исследователя творчества Алены Киш, художника Владимира Басалыги, удалось найти 13 ковров, которые составили основу коллекции рисунков Заславского историко-культурного музея-заповедника. Позже к ним добавилось значительное количество расписных ковров Язепа Дроздовича. В 1978 году Владимир Басалыга, будучи председателем Белорусского союза художников, организовал Первую республиканскую выставку народных расписных ковров в минском Дворце искусства. Впервые произведения Алены Киш увидела широкая аудитория зрителей. В марте 1999 года в Москве состоялся I Международный фестиваль «Интермузей-99», где также были представлены белорусские расписные ковры Алены Киш.

Народные традиции захватили таких известных белорусских художников, как Алексей Марочкин и Виктор Марковец, которые начали создавать собственные вариации на тему расписных ковров. Некоторые из них вошли в альбом под названием «Белорусские расписные ковры», изданный в Минске в 2005 году и составленный сотрудниками Заславского музея.

В Беларуси проводится ряд мероприятий, в процессе которых современные носители техники передают свое мастерство молодому поколению художников. Это мастер-классы, кружки по рисованию, экскурсии. Традиция изготовления расписных ковров является локальной культурной изюминкой Беларуси, художественной традицией со специальными приемами выполнения и признается как элемент народного наследия. Расписные ковры Витебского Поозерья внесены в государственный список историко-культурных ценностей. Это решение было принято на заседании Белорусской республиканской научно-методической рады по вопросам историко-культурного наследия при Министерстве культуры Беларуси.

Одна из крупных коллекций расписных ковров находится в Вилейском краеведческом музее. Передвижная выставка ковров из его коллекции экспонировалась в сентябре 2013 года в Минской художественной галерее произведений Леонида Щемелева, а потом и по другим городам страны:

В декабре 2013 года состоялась выставка расписных ковров Алены Киш «На счастье» из коллекции Заславского музея в Художественной галерее Михаила Савицкого. Открывал вернисаж директор историко-культурного музея-заповедника «Заславль», искусствовед Николай Пограновский.

В настоящее время расписные ковры переживают свою эпоху возрождения. Большой интерес не только со стороны искусствоведов и

художников, но и в целом национальная тенденция к возрождению белорусских традиций популяризирует это направление в наивном искусстве. Во время глобализации, и стремительного развития инновационных технологий встает необходимость в душевных, простых до наивности парадигмах. Народное творчество всегда было источником духовности, естественных человеческих ценностей и понятной каждому эстетики.

**Приложение 2**

МАЙСТАР-КЛАС АД СВЯТЛАНЫ СКАВЫРКА -
НАРОДНАГА МАЙСТРА БЕЛАРУСІ ПА МАЛЯВАНЦЫ.

**Дата правядзення:** 18 жніўня 2021года.
**Месца правядзення:** Глыбоцкі Дом рамёстваў.
**Тэма:** “Упрыгожым хату маляваным дыванам”.
**Задачы:**

Пазнаёміць дзяцей з творчасцю таленавітага земляка Глыбоччыны Язэпам Дразовічам.

Научыць дзяцей прасцейшым прыёмам роспісу па тканіне.

Пазнаёміць дзяцей з рознымі тэхнікамі роспісу па палатне.

Размаляваць сурвэтку.

Развіваць у дзяцей цікавасць да знаёмства з майстрамі роспісу на палатне.

Развіваць мелкую маторыку рук, пачуццё густу, колеру.

Выхоўваць павагу да беларускіх традыцый і рамёстваў.

Напачатку занятку праводзіцца экскурсія па персанальнай выставе маляваных дываноў з асабістай калекцыі майстра і дзіцячых работ па маляванцы.

С.А.СКАВЫРКА: Дзень добры, паважаныя сябры. Мне вельмі прыемна бачыць вас на нашай сустрэчы. Я вельмі радая, што ёсць такія маладыя людзі, якім цікава творчасць нашага земляка Язэпа Драздовіча. Кожны з вас ведае, што Драздовіч быў вельмі таленавіты. І адным з яго талентаў з’яўляецца маляванне па тканіне, ці маляванкі. Дарэчы, хачу дадаць, што роспіс па палатне свой росквіт атрымаў у пасляваенны перыяд, у 50-60 гады. Актуальнасць абумоўлена была тым, што ў насельніцтва не было дастатковa сродкаў, каб набыць у краме рэчы для ўпрыгожвання побыту. Кавалак саматканай тканіны быў у кожнай хаце ў кожнай гаспадыні. Мастакі, якія займаліся роспісам па палатне, вандраалі ад вёскі да вёскі, размалёўвалі тканіну, ператвараючы яе ў дываны. Для такіх мастакоў гэта быў заробак на хлеб. Вось так зарабляў і Язэп Драздовіч. Яго прыгожыя дываны і па сёняшні дзень упрыгожваюць сцены музейных пакояў, пакараючы гледачоў. Калі паглядаеш на маляванкі, здзіўляешся, што самыя простыя ўзоры выкладваюцца ў прыгожыя дываны. Вось і мы зараз з вамі паспрабуем

размаляваць ражок. Ражок – гэта невялічкая сурвэтка, якая служыла даўней для ўпрыгожвання палічак і этажэрак.

**Практычная частка**.

С.А.СКАВЫРКА: Зараз кожны з вас возьме па аднаму ражку. Я падрыхтавала неабходныя матэрыялы – пэнзалі, гуашавыя фарбы, клей ПВА, а таксама штампы розных відаў кветак.

Спачатку робім эскіз. Цяпер разводзім клей ПВА з фарбамі, каб атрымалася аднастайная маса. Бяром у рукі пэнзаль і вельмі акуратна наносім фарбу вось на гэтыя загатоўкі-штампы. Затым штамп прыціскаем да тканіны і павольна падымаем яго, каб не размазаць фарбы. Далей робім адбіткі розных відаў кветак, якія можна зрабіць рознакаляровымі. Паназіраем, калі фарбы не шчыльна зафарбавалі тканіну, трэба, ўзяўшы пэнзаль, акуратна падфарбаваць тыя месцы. Вось так і проста, і цікава можна ўпрыгожыць свае пакоі ў хаце. У вас вельмі прыгожа атрымалася, бо вы вельмі добра папрацавалі. Вы ўсе малайцы, дзякуй за працу. Да новых сустрэч.

Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі “Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі”

## ДАСЛЕДЧЫ МАСТАЦКІ ПРАЕКТ “ТЭКСТЫЛЬНАЯ НАРОДНАЯ ЛЯЛЬКА”

*Савулава Віта Пятроўна, педагог дадатковай адукацыі,*
*кіраўнік аб’яднання па інтарэсах*
*“Мяккая і дэкаратыўная цацка”*

### Уводзіны

У сучасным грамадстве востра адчуваецца адраджэнне цікавасці да гісторыі беларускага народа, яго культуры, традыцый, звычаяў, побыту. І гэта не толькі даўніна! Людзі цягнуцца да пазнання жыцця продкаў, іх жыццёвай мудрасці, вопыту і спакою. Вялікай крыніцай пазнання беларускай культуры з'яўляецца народная творчасць. Адным з цікавых напрамкаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з'яўляецца народная тэкстыльная лялька. Імкненне навучэнцаў, якія займаюцца вырабам мяккіх і дэкаратыўных цацак, даведацца, у якія лялькі гулялі нашы продкі, калі былі малымі дзецьмі, што для іх яны значылі і як уплывалі на іх жыццё, з’яўляецца не толькі пазнавальнай цікавасцю, але яшчэ і натуральным імкненнем ведаць і памятаць мінулае свайго народа. Абудзіць і падтрымаць гэтую цікавасць

дзяцей да беларускай народнай творчасці праз вывучэнне традыцыйнай народнай лялькі дапаможа праект “Тэкстыльная народная лялька”. Гэта тэма з’яўляецца актуальнай, таму што яна вельмі блізкая і сучаснаму дзіцяці. Лялек любяць усе: дарослыя і дзеці. Для дзяцей яны забава, а дарослыя з радасцю глядзяць на прыгожыя цацкі, якія дастаўляюць ім радасць і вяртаюць у дзяцінства. Лялька – самая старажытная і папулярная цацка. Яна – абавязковы спадарожнік дзіцячых гульняў і самы даступны твор мастацтва.



Удзельнікамі праекта сталі навучэнцы аб’яднання па інтарэсах “Мяккая і дэкаратыўная цацка”, якое працуе на базе Дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Докшіцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі” з 2012 года.

Адпраўной кропкай для выбару тэмы стала экскурсія ў Докшыцкі гарадскі цэнтр традыцыйнай культуры, дзе мы пазнаёміліся з лялечным тэатрам “Батлейка”. Увогуле, падобны від тэатра вядомы з XVI стагоддзя. Аднак у Докшыцах найбольшую папулярнасць ён набыў у пачатку XX стагоддзя пад кіраўніцтвам Патупчыка (па мянушцы Клезмер). Пра батлейку Патупчыка гаворыцца нават у Энцыклапедыі “Этнаграфія Беларусі” 1989 года і ў 2-м томе Беларускай энцыклапедыі 1996 года. Пасля Патупчыка батлейка ў Докшыцах прыйшла ў заняпад. І толькі ў 1999 годзе ў Гарадскім цэнтры культуры аднавілі батлейку і сталі ладзіць перыядычныя спектаклі. У 2003 годзе докшыцкая батлейка нават удзельнічала ў днях культуры Віцебскай вобласці ў Мінску.

Так, навучэнцаў аб’яднання па інтарэсах “Мяккая і дэкаратыўная цацка” зацікавіў перш за ўсё “прафесійны” аспект – якім чынам ствараліся лялечныя героі для тэатра. У Патупчыка з лялькамі працавала жонка і сын. У асобных выпадках працаваў з лялькамі і сам Патупчык. Лялькі-персанажы рабіліся з дрэва, каляровай тканіны; валасы, бровы, вусы – з лёну ці аўчыны; вопратку шылі з тканіны. Лялькі ў асноўным былі пасаджаны на дрот. Але асобныя з іх, якія па ходу дзеяння рабілі паклоны, – лялькі чараўнікоў, біблейскіх герояў і тых, хто рабалебстваваў перад начальствам, – надзяваліся на сярэдні палец рукі.

Працуючы над гісторыяй докшыцкай батлейкі, навучэнцы вырашылі не спыняцца на дасягнутым, а пашырыць свае веды па гісторыі ўзнікнення ў славянскай культуры народнай лялькі. Пад кіраўніцтвам педагога Савулавай Віты Пятроўны навучэнцы сталі працаваць над праектам “Тэкстыльная народная лялька”. Пад час працы было высветлена, што адметных асаблівасцей для Докшыцкага краю па стварэнні розных відаў лялек не праследжваецца. Праўда, крыху працавалі ў дадзеным накірунку мясцовыя прафесійныя мастакі Аляксандр Сяргеевіч Вішнеўскі і Іван Парфір’евіч Плыгаўка. Іван Парфір’евіч спецыялізуецца на разьбе па дрэве. Акрамя

розных пано, драўляных скульптур ён займаўся вырабам драўлянай механічнай цацкі, традыцыі вырабу якіх на Беларусі сёння амаль забытая. Іван Парфір'евіч з'яўляецца лаўрэатам 1-га рэспубліканскага свята-конкурса разьбярства "Дрэва жыцця", лаўрэатам абласной выставы народнага мастацтва "Кругазварот-1988".

У керамічнай майстэрні А.С.Вішнеўскага, які, на жаль, нядаўна памёр, акрамя збаноў і сувенірнай прадукцыі можна знайсці гліняныя цацкі. Аляксандр Сяргеевіч амаль усё жыццё пісаў карціны, а потым вырашыў паспрабаваць сябе ў кераміцы, дзе дасягнуў поспеху і прызнання. А.С. Вішнеўскі з'яўляецца лаўрэатам абласной выставы народнага мастацтва "Кругазварот-1998", удзельнікам і дыпламантам рэспубліканскага свята "Ганчарны круг" на працягу некалькі год.

Зусім нямнога лялечнай справе ўдзяліла увагі наша славутая зямлячка Таццяна Махніст. Яна была выкладчыцай чарчэння і малявання ў школе, а затым захапілася пляценнем з саломкі. Індывідуальнасць мастачкі і дасканалы яе прафессіяналізм адзначаны на 1-м рэспубліканскім свяце-конкурсе саломапляцення "Саламяны цуд", дзе Таццяна Махніст заняла 2-е месца і была ўзнагароджана Ганаровай граматай за выкананне саламянай скульптурнай кампазіцыі "Купальская лялечка".

Толькі гэтэя звесткі удалося знайсці навучэнцам па лялечнай тэме на Докшыччыне. Безумоўна, літаратура аб Докшыцкім раёне ёсць: асобнымі раздзеламі ўключана ў кнігу "Гісторыка-дакументальная хроніка "Памяць. Докшыцкі раён", аднак жа па этнаграфіі, міфалогіі і ў цэлым пра духоўную культуру раёна амаль не існуе матэрыялаў, як і няма брашуры по гэтай тэме. У Докшыцкім раёне каля 200 населенных пунктаў, у некаторых з іх засталося па два-тры жыхары. Праз некалькі гадоў іх ужо можа не быць, а разам з імі знікае і багацейшая народная культура. Даследаваць і захаваць яе вельмі важна.

Таму для вывучэння было вырашана крыху пашырыць гарызонт даследавання і засяродзіць увагу на гісторыі лялечнай справы ў Беларусі, прызначэнні лялек у побыце нашых продкаў і г.д. Збор мастацка-краязнаўчай інфармацыі праходзіць праз непасрэдны ўдзел каляндарна-абрадавых святах, запіс мастацкага аздаблення прадметаў быту, жывыя зносіны з мясцовымі жыхарамі, якія захоўваюць і развіваюць культурную традыцыю Докшыцкага краю. Так, удзельнікі праекту наведалі мясцовага майстра-каваля Уладзіміра Шуткіна. Апошнія 20 год ён грунтоўна заняўся кавальскай справай. Уладзімір Валянцінавіч вырабіў крыж, які ўсталяваны на ўездзе ў Докшыцы. У райцэнтры ёсць і іншыя яго работы: ажурная арка каля загса, брама ля мясцовага касцёла, каваны чорны цюльпан на помніку воінам-інтэрнацыяналістам.

Сумесная праца навучэнцаў і кіраўніка аб'яднання па інтарэсах "Мяккая і дэкаратыўная цацка" спрыяла фарміраванню цікавасці да традыцыйнай культурнай спадчыны беларусаў, вывучэнню побыту і народных традыцый продкаў.

## Пашпарт праекта

**Назва праекта:** Тэкстыльная народная лялька

**Мэта праекта:** абудзіць цікавасць дзяцей да беларускай народнай культуры праз вывучэнне традыцыйнай народнай лялькі.

**Задачы:**

- пазнаёміць з гісторыяй узнікнення абрадавых і абярэгавых лялек;
- пазнаёміць з відамі лялек, высветліць іх прызначэнне;
- навучыць дзяцей вырабляць традыцыйныя тэкстыльныя лялькі;
- прыцягнуць увагу дзяцей і падлеткаў да старадаўняга мастацтва стварэння лялек.

**Тып праекта**: даследчы мастацкі праект

**Удзельнікі праекта:** навучэнцы аб'яднання па інтарэсах “Мяккая і дэкаратыўная цацка”

**Адукацыйная вобласць**: беларуская народная творчасць, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва

**Формы прадстаўлення вынікаў вопыту праекта:**

- даследчая работа;
- каляндар тэкстыльнай традыцыйнай лялькі на 2023 год.

**Метады, выкарыстаныя ў праекце:**

- пошукавы – падбор літаратуры, сістэматызацыя;
- даследчы – вывучэнне літаратуры па дадзенай тэме, атрыманне інфармацыі з інтэрнэт-рэсурсаў, абмеркаванне атрыманай інфармацыі па тэме работы, прагляд узораў традыцыйных беларускіх лялек, параўнальны аналіз;
- практычны – выраб лялек.

**Тэрмін рэалізацыі праекту:**

студзень-снежань 2022 года.

### Этапы рэалізацыі праекта:

| Этапы | Тэрміны рэалізацыі | Змест |
|---|---|---|
| Арганізацыйна-падрыхтоўчы этап | Студзень 2021г. | Абмеркаванне паслядоўнасці і вызначэнне форм работы над праектам |
| Асноўны этап: даследчы<br><br>практычны | Студзень-май 2022г.<br><br>Май-кастрычнік 2022г. | Пашукова-даследчая работа. Наведванне раённай бібліятэкі, экскурсіі ў Докшыцкі гарадскі цэнтр традыцыйнай культуры, Докшыцкі раённы дом рамёстваў. |

| | | |
|---|---|---|
| | | Работа з інтэрнэт –рэсурсамі па тэме “Тэкстыльная народная лялька”. Творчая работа па вырабу лялек. Распрацоўка і афармленне наляндара тэкстыльнай традыцыйнай лялькі на 2023 год |
| Заключны этап | Кастрычнік - снежань 2022г. | Майстар-клас “Тэкстыльная народная лялька”. Прэзентацыя праекта |

## Рэалізацыя праекта

**І.Арганізацыйна-падрыхтоўчы этап**

На аграніізацыйна-падрыхтоўчым этапе прайшло абмеркаванне паслядоўнасці работы над праектам. Былі вызначаны крыніцы пошуку інфармацыі па тэме праекта: зварот да навукова-літаратурных крыніц у раённай бібліятэцы, у Інтэрнэт-прасторы. Таксама былі вызначаны формы работы над праектам: даследніцкая дзейнасць і творчая практычная дзейнасць. Было вырашана пасля вывучэння гісторыі ўзнікнення абрадавых і абярэгавых лялек, іх відаў, паспрабаваць пераняць вопыт продкаў і самастойна стварыць традыцыйныя народныя лялькі.

Вынікам даследчай работы над праектам павінен стаць каляндар тэкстыльнай традыцыйнай лялькі на 2023 год .

**ІІ.Асноўны этап**

Асноўны этап работы над праектам падзяляецца на два этапы: даследчы і практычны.

**1.Даследчы этап**

Прадмет даследавання: беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Аб’ект даследавання: беларуская народная тэкстыльная лялька.

Даследчы этап работы над пректам – самы працяглы, вельмі адказны. Ад таго, наколькі грунтоўна ўдаецца паглыбіцца ў вывучэнне тэмы, у многім залежыць канчатковы вынік.

Гэты этап прадугледжваў вывучэнне літаратуры па дадзенай тэме, атрыманне інфармацыі з інтэрнэт-рэсурсаў, абмеркаванне атрыманай інфармацыі, яе сістэматызацыя, вычляненне галоўнага матэрыялу, неабходнага для рэалізацыі практычнага этапу работы. Прагляд узораў традыцыйных беларускіх лялек, іх параўнальны аналіз – таксама неабходныя, паступовыя крокі да рэалізацііі выніковай ідэі праекта – вырабу традыцыйных народных лялек і стварэння календара  тэкстыльнай традыцыйнай лялькі на 2023 год.

 

## З гісторыі традыцыйных народных лялек

Гісторыя ўзнікнення ў славянскай культуры народнай лялькі пачынаецца ў глыбокай старажытнасці, з дахрысціянскіх часоў, калі людзі верылі, што звычайны скрутак тканіны валодае магічнай сілай. Першыя лялькі выраблялі з прыродных матэрыялаў той мясцовасці, дзе жыў чалавек. Каб супакоіць дзіця, якое плача, маці давала яму ў ручкі палачкі і каменьчыкі, скручаныя кавалачкі скуры, плеценыя фігуркі з саломы, лісця, фігуркі з гліны. Гэта і былі першыя цацкі. З'яўленне нітак, вяровак, тканін і іншых матэрыялаў дало пачатак стварэнню фігурак, якія абазначаюць чалавека. Так узнікла лялька з тканіны. Адна з першых лялек на тэрыторыі нашай краіны была дзіўная лялька "Галава". Белую хустку шчыльна набівалі жнівам, а з канцоў, завязаных у вузлы, утваралі рукі і ногі. Затым галаву ад тулава аддзялялі пасярэдзіне крыж-накрыж чырвонай ніткай. Магчыма, такой была першая лялька. З развіццём прамысловасці ўскладняўся яе выраб. Яшчэ ў сярэдзіне XX ст. у кожнай сям'і дзеці гулялі з традыцыйнымі лялькамі. І толькі з 1960-х гадоў, калі прамысловыя прадпрыемствы пачалі выпускаць мільённыя партыі лялек з пластмасы, традыцыя вырабу хатняй лялькі амаль згасла. Аднак не знікла зусім, будучы глыбока адкладзенай ў народнай памяці.

З даўніх часоў лялька была традыцыйнай цацкай беларускага народа. Яна была не проста цацкай, а сімвалам працягу роду, закладам сямейнага шчасця, суправаджала чалавека ад нараджэння і да смерці, была абавязковым атрыбутам любых святаў. Іх рабілі не для продажу, а для сябе, як абярэгі, як рытуальныя і абрадавыя сімвалы. Лялькі з тканіны былі ў асноўным жаночым вобразам. У народных вераваннях жаночыя міфалагічныя персанажы выступалі заступнікамі лёсу, шлюбу, урадлівасці, хатняга дабрабыту. Лялькі заўсёды выраблялі з натуральнага матэрыялу: паркаль, лён, бавоўна, салома, лаза, дрэва. Пры вырабе абярэгавых і абрадавых лялек нельга выкарыстоўваць нажніцы і іголкі, каб не нашкодзіць лёсу таго, каму гэтая лялька прызначаецца. Тканіну рвуць рукамі і перавязваюць кавалачкамі нітак. Лялек рабілі толькі з паношанага адзення, выкарыстоўвалі цэлыя кавалкі зношанай вопраткі, насычанай энергіяй канкрэтнай асобы. Такая тканіна сімвалізавала жыццёвую сілу роднага чалавека. На працягу доўгага

часу лялька была бязлікай. Нашы продкі лічылі, што разам з тварам, цацка атрымлівае душу, а значыць, становіцца безабароннай перад злым вокам. Лялька без твару лічылася неадушаўлёным прадметам, недаступным для ўсялення ў яго злых сіл, а значыць, бясшкодная для дзіцяці. Яна павінна была прынесці дабрабыт і радасць. У магічнай лялькі мог быць раскошны бюст, які сімвалізуе багацце: шмат дзяцей, а таксама пладавітасць хатняй жывёлы, добры ўраджай. А на месцы вачэй і носа ў такіх жаночых фігурак у традыцыі беларускага Падняпроўя былі перакрыжаваныя чырвоныя ніткі – сонечны сімвал: "сонца дае жыццё". Фартух – важны складнік убору лялькі. Лічылася, чым ён даўжэй, тым больш дзяцей будзе ў сям'і, а пакрытая жаночая галава была сімвалам разважлівасці і мудрасці. Лялькі-абярэгі ў Беларусі былі больш распаўсюджаны пераважна ў Віцебскай вобласці. Многія з іх беражліва захоўваліся ў сям'і, перадаваліся з пакалення ў пакаленне разам з традыцыйнымі прыёмамі вырабу. Нашы продкі строга сачылі, каб сваіх лялек дзеці ніколі не пакідалі на вуліцы і не раскідалі па хаце, а берaглі ў кошыках, скрынях, замыкалі ў куфэрку, а некаторых захоўвалі пад абразамі. У кожнай сям'і было шмат лялек, таму што выкінуць старую, зношаную цацку, а тым больш сапсаваць, зламаць ці спаліць было вялікім грахом. А вось дарыць лялькі было распаўсюджаным звычаем – падарунак прыносіў здароўе і дабрабыт.

Акрамя гульнёвай функцыі, лялькі выкарыстоўваліся ў многіх абрадах і рытуалах. Гэта былі спецыяльна вырабленыя фігуркі, з якімі не дазвалялася гуляць, лічылася, што яны валодаюць магічнай сілай, часцей за ўсё іх захоўвалі ў месцах, недаступных для чужога вока і даставалі, калі прыходзіў час здзяйсняць той ці іншы абрад: збор ураджаю, сустрэча вясны, заручыны, жаніцьба, хрэсьбіны. Некаторых з іх ставілі, наадварот, на бачнае месца для выканання сваіх функцый – прыцягваць дастатак у доме, пазбаўляць ад хвароб. Лялькі рабіліся на ўсе выпадкі жыцця.

Прызначэнне абярэгаў звязана з асноўнымі патрэбамі чалавека – ахоўваць ад нягод, прыносіць шчасце, даваць здароўе, берагчы ў далёкай дарозе, прыцягваць багацце, поспех, каханне, адвадзіць ад сям'і сурокі і чары. У асноўным карысталіся рознымі варыянтамі скручвання, матання, пляцення, перавязвання. Дэталі фармавалі і злучалі між сабой з дапамогай розных нітак, вяровачак, тасёмак, якія завязвалі на няцотную колькасць вузельчыкаў, змацоўвалі чырвонай абярэжнай ніткай. З гэтай жа ніткі на грудзях лялькі рабіўся абярэжны крыж. Каб узмацніць ахоўныя ўласцівасці, выраб вельмі часта суправаджаўся рознымі нагаворамі, абавязкова чытаўся з чыстымі намерамі і шчырымі пажаданнямі, але былі і такія, якія патрабавалі маўчання.

Лялькі трэба было майстраваць адразу, не перапыняючыся і не перарабляючы: паўторныя дзеянні перакрэслівалі першыя і пазбаўлялі выраб цудадзейнай сілы. Кожнай быў уласцівы свой памер, свая тэхналогія выканання. З лепшымі было прынята хадзіць на вячоркі, і аб тым, як яны былі зроблены, судзілі аб майстэрстве і гусце іх уладальніцы. Лялька была

эталонам рукадзелля. Яе бралі на жніво і на вячоркі, клалі ў пасаг маладой, з ёй хадзілі ў госці.



*"Аддарак на падарунак"*

Лялька была не толькі дзявочай забавай, гулялі з ёй усе дзеці да 7-8 гадоў, бо да гэтага часу яны хадзілі ў кашулях. Як толькі хлопчыкі пачыналі насіць штаны, а дзяўчынкі спадніцу, іх гульнявыя ролі і самі гульні хутка падзяляліся. Пакуль яны былі маленькімі, лялькі шылі маці, бабулі, старэйшыя сёстры, а з 4-5 гадоў ужо магла рабіць такую ляльку любая дзяўчынка. Чатырохгадовых унука ці ўнучку гадоў бабуля вучыла рабіць "Аддарак на падарунак"

Гэта была першая лялька ў жыцці дзіцяці, якую ён рабіў сваімі рукамі для бацькоў. Такой лялькай дзякавалі за падарунак або за добрае слова. Самастойны яе выраб быў свайго роду пасвячэннем дзіцяці ў дарослае жыццё.



*"Каша"*

Родзічы малым дзяўчатам рабілі "Кашу". Гэта была лялька-мерка, падобная на мяшочак, яе перавязвалі чырвонымі ніткамі ў асаблівых месцах, якія былі для будучай гаспадынькі мернымі рыскамі. Лялька "Каша" рабілася пад чыгунок, дзе звычацна маці варыла кашу, каб дачушка сама навучылася яе ў печы гатаваць. Малая ставіла ляльку каля чыгунка і прыгаворвала: "Круп насыпай па калена, вады налівай па пояс, а кашы атрымаеш па рыльца".

У лялечных гульнях дзеці міжвольна вучыліся шыць, вышываць, прасці, пасцігалі традыцыйнае мастацтва апranання, вучыліся весці гаспадарку, фарміравалі для сябе вобраз сям'і.

На працягу года праходзяць розныя святы, у якіх праводзяцца розныя абрады, і ў іх вядучую ролю адыгрывае лялька. Многія старажытныя народы, каб залагодзіць багоў, прыносілі ім у ахвяру людзей. Быў такі звычай і ў нашых продкаў. У ахвяру багіні ўрадлівасці яны прыносілі жанчын. Але аднойчы некаму прыйшло ў галаву аддаць багам замест жывой жанчыны ляльку. І багі не адмовіліся ад гэтай цацкі! Некаторыя з гэтых звычаяў захаваліся да сённяшняга часу, іх можна назіраць у вясnова-летні перыяд. Рытуальныя лялькі робяць з прыроднага матэрыялу (травы, галінак, кветак), а затым апранаюць у тканіну, надзяюць на галовы вянкі, завязваюць стужку і задаволіўшыся з лялькамі ў гульнях, карагодах хаваюць іх: аддаюць лялькі вадзе, агню, зямлі або паветру. Так, праз "дамоўленасць" са стыхіямі здзяйсняліся прынашэнні Багам. Яскравы прыклад гэтаму, які дайшоў да нас, звычай майстраваць і спальваць на праводзінах зімы ляльку Масленіцы. Згараючы, яна ператвараецца ў попел, які з'яўляецца духоўным негатывам, што назапасіўся ў людзей за доўгую зіму, такім чынам дапамагае ачысціцца ад дрэннай энергетыкі.

Лялька сярод усіх цацак займае асобнае месца, паколькі ўяўляе сабой спосаб пазнання жыцця і знак чалавека, яго гульнявы вобраз-сімвал. У гэтай

ролі яна фіксуе час, гісторыю, культуру народа, адлюстроўвае іх рух і развіццё.

Тэкстыльныя абрадавыя лялькі маюць сваю класіфікацыю:

па тэхналогіі вырабу (матанкі-закруткі, кувадкі з квадратных кавалкаў тканіны) ;

па абрадах (сямейна-бытавыя, каляндарныя);

па функцыі магічнай сілы: ахоўныя, ачышчальныя і замяшчальныя.

**Віды традыцыйных лялек**

Па сваім прызначэнні лялькі дзеляцца на тры вялікія групы: лялькі-абярэгі, абрадавыя, гульнявыя.

**Лялькі-абярэгі**



Ахоўная лялька берагла сям’ю ад сварак, хвароб і нягод, служыла абярэгам ад псуты і сурокаў.

**Званочак:** Лялька “Званочак” – вясёлая, жыццярадасная, яна веснік добрых вестак і добрага настрою. Звон званочкаў аберагаў людзей ад страшных хвароб. Ён звінеў пад дугой на ўсіх святочных тройках. Яго купалападобная форма зверху нагадвае сонейка. У лялькі тры спадніцы гэта нагадвае, што шчасце складаецца таксама з трох частак. Калі целу добра, душы добра, духу выдатна, то чалавек цалкам шчаслівы.

Дорачы “Званочак”, чалавек жадае свайму сябру атрымліваць толькі добрыя весткі і падтрымлівае ў ім радасны настрой.

**Анёлак:** Анёлы – добрыя духі, абаронцы і памочнікі ва ўсіх нашых справах і пачынаннях. Лічыцца, што фігуркі анёлаў, зробленыя сваімі рукамі для кроўных сваякоў, ператвараюцца ў моцныя абярэгі дома. Іх рабілі ў падарунак на імяніны.



“Анёлак”



“Жаданніца”

**Жаданніца:** Лялька “Жаданніца” была ў кожнай дзяўчыны. Паказваць яе нікому не варта было, а калі хацелі, каб жаданне споўнілася, прышывалі ў падарунак на сукенку лялькі пацерку або прывязвалі стужачку, прыгаворваючы: “Паглядзі, якая ты прыгажуня, за гэта выканай маё жаданне” і загадвалі што-небудзь патаемнае. Пасля таго, як жаданне загадана, ляльку нікому не паказвалі. З ёй размаўлялі як з сяброўкай.

**Акіла-агурочнік:** Акіла-агурочнік – лялька для знішчэння цвілі ў бочках з салёнымі агуркамі. Галава ў яго набіта насеннем гарчыцы і таму цяжэй цела. Плавае



Акіла ў расоле ўніз галавой, і гарчыца не дае расці цвілі. Для вырабу Акілы трэба нефарбаваная тканіна і ніткі з натуральных валокнаў.

*"Акіла-агурочнік"*

**Сімволіка абярэгаў:**
мятла – вымятае з хаты сваркі і негатыў;
мак – сімвал выканання жаданняў;
часнок – абараняе ад нячыстай сілы;
хлеб – каб была гасціннай хата, а таксама духоўнае і матэрыяльнае багацце;
грэчка, рыс – дастатак ў хаце;
насенне сланечніка – энергія сонца і здароўя;
мяшок – багацце, дастатак;
палатно – шчасце ў хаце;
жаўрукі – сімвал урадлівасці;
падкова – поспех, шчасце;
арэх – сімвал сілы, мудрасці, даўгалецця;
кветка – сімвал здароўя.

## Абрадавыя лялькі

Абрадавых лялек шанавалі і ставілі ў хаце, у чырвоны кут. Яны мелі рытуальнае прызначэнне. Лічылася, што калі ў доме ёсць зробленая сваімі рукамі лялька то будзе дастатак у хаце і добры ўраджай.

**Пакосніца:** Лялька "Пакосніца" адлюстроўвала жанчыну падчас сенакосу. Летам у сялян работы хоць адбаўляй. З дзеткамі займацца не было калі, вось бацькі і прыдумалі ляльку-Пакосніцу, каб заняць малое. Яна рабілася з суцэльнага кавалка тканіны. Фарміравалася галава, перавязваліся ніткамі рукі, на ляльку апраналі спадніцу, фартух (прытым павінна быць бачна кашуля – светлая аснова лялькі), павязвалі хустку. Для вырабу лялькі выкарыстоўвалася светлая тканіна, бо першы пакос здаўна лічыўся святам. Таксама рабілі гэтую ляльку з травы (скручвалі накшталт лялькі).

**Масленіца:** Старажытнае славянскае свята Масленіца, дасталося нам у спадчыну і захавалася пасля прыняцця хрысціянства. Масленіца – каляндарная лялька. Яе рабілі ў дзень, калі святкавалі вясновае раўнадзенства, аддаючы пашану сонцу, якое дае жыццё ўсяму на зямлі. Яна была зроблена з саломы ці лыка, але абавязкова выкарыстоўвалі дрэва – тонкі ствол бярозы. Салома, як і дрэва, увасабляла буйную сілу раслiннасці. Адзенне на ляльцы было абавязкова з раслінным малюнкам. Яе замацоўвалі на крыжавіне з дрэва. Ляльку ўпрыгожвалі стужкамі, штучнымі кветкамі. На рукі яе вешалі матузы, завязваючы якія, людзі загадвалі жаданні. Гэтыя матузы, каб жаданні спраўдзіліся, павінны былі згарэць разам з лялькай, якую спальвалі на вогнішчы, выконваючы абрад ачышчэння.

**Марцінічкі:** "Марцінічкі" – гэта злучаныя паяском дзве лялькі, скручаныя з нітак – белых і чырвоных. Белыя ніткі – сімвал адыходзячай зімы, чырвоныя – сімвал вясны



і гарачага сонца, а разам яны ўвасабляюць сілу і волю багоў на гэта жыццё. Злучаныя мужчынская і жаночая фігуркі сімвалізуюць адзінства двух пачаткаў. Рабілася гэтая лялька ў сакавіку. Ёю “заклікалі” вясну, набліжалі яе пачатак, святкавалі і радаваліся прыходу. Па традыцыі, 1 сакавіка “Марцінічкі” прымацоўвалі на вопратку блізкім людзям і насілі да тых часоў, пакуль не атрымаецца ўбачыць першага бусла. Пасля гэтага іх пускалі па вадзе, або прывязвалі да галінкі квітнеючага пладовага дрэва і загадвалі жаданне.

## Гульнявыя лялькі

Гульнявыя лялькі прызначаліся для дзіцячых забаў.



*“Стрыгушка”*

**Стрыгушка:** Самай распаўсюджанай дзіцячай гульнявой лялькай была “Стрыгушка”. Рабілася яна са стрыжанай травы. Калі жанчына сыходзіла ў поле, яна брала дзіця, і каб ён мог гуляць з чым-небудзь, рабіла яму ляльку з травы. Часта такую ляльку выкарыстоўвалі і ў лекавых мэтах. Калі дзіця хварэла, то ў ляльку ўплятаці лекавыя травы, каб пах травы аказваў лячэбнае дзеянне на яго.

**Лялька на лыжцы:** Асновай служыла звычайная драўляная лыжка. Гулялі з ёй дзеці ў канцы 19-га, пачатку 20-га стагоддзя. Дзіця 5-ці, 6-ці гадоў магло зрабіць такую ляльку самастойна, а для маленькіх дзетак яе вырабляла маці. Пасля прыняцця ежы маці не мыла лыжку, а проста чыста і насуха яе выцірала. Затым даставала са свайго куфра кавалачкі тканіны, рабіла ляльку і клала ў калыску да свайго малога. Дзіця гуляла і засынала. Пасля гэтага маці забірала ляльку, разбірала яе, мыла посуд, рабіла справы па гаспадарцы, а лыжкай зноў карысталіся па прызначэнні.



*“Лялька на лыжцы”*

**Бярозка:** Бяроза – дрэва, якому пакланяліся і ўжывалі ў розных абрадах, якія забяспечваюць шчаслівае жыццё. Для варажбы рабілі ляльку “Бярозка” з бярозавага палена, сімвал бярозы. Гэта лялька аднаго дня, па ёй варажылі. Раніцай рабілі, вечарам – разбіралі і пакідалі на бярозе. Рабілі яе сумесна некалькі дзяўчат, прыгожа прыбіралі, упрыгожвалі галінкамі бярозы, травой з суквеццямі.



*“Бярозка”*



*“Зайчык на пальчык”*

**Зайчык на пальчык:** “Зайчык на пальчык” рабілі дзецям з трох гадоў, каб яны мелі сябра, суразмоўцу. Зайчык апранаецца на пальчык і заўсёды побач з табой. Гэтую цацку раней бацькі давалі дзецям, калі сыходзілі з дома. Калі малому было сумна ці страшна, ён у любы момант мог звярнуцца да лялькі як да сябра, пагаварыць з ім, паскардзіцца або проста пагуляць. Гэта і сябар, і абярэг. Дзеці былі вельмі



задаволеныя і ў любімай ляльцы бачылі родную душу, размаўлялі з ёй, як з жывым чалавекам.

**Палена:** Першапачаткова лялька “Палена” ўяўляла сабой драўлянае палена, упрыгожанае жаночай вопраткай. Потым прыйшла больш складаная форма лялькі: тулава – кавалак тканіны, згорнуты ў качалку, абцягнутае ільняной тканінай твар, кудзельная або валасяная каса.

*“Палена”*

**2.Практычны этап**

Перад тым, як пачаць выраб народных лялек з навучэнцамі, была праведзена падрыхтоўчая работа: наведалі Докшыцкую раённую бібліятэку, Докшыцкі раённы Дом рамёстваў, прагледзелі інтэрнэт-рэсурсы, цікавіліся ў старэйшага пакалення пра народныя лялькі і працэссы іх вырабу, потым абмяркоўвалі сабраны матэрыял. Зыходзячы з атрыманай інфармацыі, прыступілі да практыкі. Разнастайнасць лялек вялікая, адразу ўсіх немагчыма запомніць і зрабіць, таму свой выбар



зрабілі з улікам пор года. Нашы продкі ведалі, якую ляльку можна зрабіць у той ці іншы час года, каб гледзячы на яе, можна было здагадацца, да якога каляндарнага месяца адносіцца гэты выраб. Дзеці зразумелі, што многія лялькі для продкаў з’яўляліся абярэгамі іх духоўнай і фізічнай моцы, таму вырашылі паспрабаваць зрабіць на аснове літаратуры і матэрыялаў інтэрнэт рэсурсаў лялек, якія ім больш за ўсё спадабаліся і суадносіліся са святамі, якія прыходзяцца на тую ці іншую пару года. Існуе шмат спосабаў іх вырабу. Таму ў рабоце за аснову былі ўзяты найбольш распаўсюджаныя, якія сустракаюцца ў літаратуры і якімі карыстаюцца майстры. У выніку атрымалася 12 лялек.

**III.Заключны этап**

Заключны этап прадугледжваў:

- падвядзенне вынікаў работы над праектам;
- сістэматызацыя і апісанне даследчай часткі праекта;
- афармленне і выданне календара на 2023 год.

На станаўленне і развіццё беларускай традыцыйнай абраднасці на працягу апошняга тысячагоддзя аказалі значны ўплыў розныя рэлігійныя веравучэнні, якія, умацоўваючы свае пазіцыі ў нашым краі, нярэдка імкнуліся абвергнуць спрадвечныя мясцовыя абрады, звычаі, вераванні і г. д., падмяняючы іх аналагічнымі новаўвядзеннямі ці падробкамі, якія грунтаваліся на ўласнай светапоглядней аснове. Але, як сведчыць гістарычная рэальнасць, народныя традыцыі нельга наўмысна ні выжыць, ні падмяніць, ні забараніць, акрамя тых выпадкаў, калі яны свядома губляюцца і адыходзяць у нябыт у этнічнай памяці, як аджыўшае і непатрэбнае звяно ў культурным укладзе жыцця. Яскравым сведчаннем таму ўпартая барацьба хрысціянства з язычніцтвам, што вялася на працягу цэлага тысячагоддзя, але,

відавочна, вынікі яе малазначныя, бо яна не змагла канчаткова зламаць рэлігійныя светапоглядныя пастулаты нашых далёкіх продкаў-язычнікаў, якія




так і захаваліся ў свядомасці людзей да нашых часоў. У сённяшнім выглядзе і язычвіцтва, і хрысціянства хутчэй утвараюць цэласную аснову культурнага здабытку нацыі.
Беларускі народны каляндар – адна з форм духоўнага жыцця нацыі, сістэма свят, прысвяткаў, абрадаў, гульняў, ігрышчаў, пэўных дзен забарон, што замацаваны ў быце і фальклоры беларусаў. Прааналізаваўшы розныя варыянты беларускіх народных каляндароў, мы зрабілі вывад, што па нашай тэме каляндароў практычна няма. У нейкай ступені гэта ўскладніла нашу задачу. Тым не менш, работа была пачата.

На аснове сабранага матэрыялу быў распрацаваны каляндар на 2023 год “Тэкстыльная народная лялька”, у якім можна пазнаёміцца з абярэгавай моцай лялек, у якую верылі нашы продкі. Лялька не нараджаецца сама – яе стварае чалавек. Яна набывае жыццѐ пры дапамозе ўяўлення і волі свайго стваральніка. З’яўляючыся часткай культуры ўсяго чалавецтва, лялька захоўвае ў сваім вобразе самабытнасць і характэрныя рысы, якія стварае народ. У гэтым і ёсць галоўная каштоўнасць традыцыйнай народнай лялькі. Гуляючы, дзеці глядзяць на розныя жыццёвыя сітуацыі: вяселле, прыём гасцей, нараджэнне немаўляці. Гэта далучае іх да традыцый, культуры народа, дабрыні і прыгажосці. Тым самым яны ўводзяць дзіця ў вялікі свет. Сёння, сярод разнастайнасці сучасных лялек, народныя лялькі з тканіны з’яўляюцца асаблівым відам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У нашы дні яны і становяцца ўсё больш і больш папулярнымі.

**Заключэнне**

Народная лялька з’яўляецца ўвасабленнем дабра і лагоднасці. Гэта абярэг чалавечай душы і лёсу, сімвал продкаў. У час даследавання дзецям было вельмі цікава разабрацца ў назвах і прызначэннях лялек-абярэгаў. На першы погляд гэтыя лялькі ў параўнанні з сучаснымі здаліся ім вельмі простымі, а некаторыя, нават смешнымі. Але калі самі пачалі іх вырабляць, то аказалася, што не так ужо і хутка і добра ў іх ўсё атрымліваецца, як гэта здавалася, асабліва калі яны рабілі гэта ўпершыню. І калі навучэнцы самі вырабілі не адну ляльку, то пачалі атрымліваць ад гэтага працэсу задавальненне, зразумелі, што ў іх крыецца цяпло чалавечых рук: а цяпер і іх умелых рук.

Калі дзеці будуць цікавіцца беларускай народнай творчасцю і самі будзуць спрабаваць выраблять народную тэкстыльную ляльку, то гэты від дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва будзе жыць і будзе запатрабаваны ў сучасным і будучым часе.

Старажытнае мастацтва стварэння народных лялек жыве да гэтага часу. Сведчанне таму – выставы такіх лялек на розных фестывалях, кірмашах. Некаторыя людзі і па сённяшні час вераць у значнасць і магію лялек і спадзяюцца, што такая простая лялька ў нашым сучасным і неспакойным свеце прынясе ім поспех і спакой. Упэўніцца ў гэтым некаторыя навучэнцы аб’яднання па інтарэсах змаглі падчас наведвання горада майстроў на “Славянскім базары” ў Віцебску, калі як адна жанчына пыталася ў майстра: ”Ці ёсць у вас лялька, што дапамагае дзяўчыне выйсці замуж і мець добрую долю?” Дзеці ўспомнілі пра гэты выпадак, калі займаліся распрацоўкай календара, і таму ўнеслі ў яго звесткі аб тым, якой карыснай магіяй валодае тая ці іншая лялька. А, можа, і праўда ў ляльках ёсць нейкая сіла, якая дапамагае ім існаваць і па сённяшні дзень.

Дзякуючы праекту, навучэнцы змаглі пашырыць свае веды аб народных традыцыях нашых продкаў, а галоўнае – самі навучыліся рабіць прыгожыя лялькі. У будучым работа па дадзенай тэме будзе працягвацца далей, таму што ў гэтым відзе дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва яшчэ шмат нязведанага, новага і цікавага.

**Літаратура і інфармацыйны рэсурс**


1. Беларуская лялька – бренд…– Новости OPEN.BY [Электронный ресурс]. – Режим доступа: open.by›region/83212
2. Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т.2: Аршыца – Беларусцы / рэд.кал.: Г.П.Пашкоў (гал.рэд.) і інш. – Мінск: БелЭН, 1996. – С 349;
3. Качан, Г.Н. Куклы: обереги, обрядовые, игровые. Иллюстрированный мастер класс / Г.К. Качан – Минск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017. – 78 с.: іл. – (Энцыклапедыя народного мастера);
4. Качан, Г.Н. На счастье, на долю: традиционные народные куклы. Иллюстрированный мастер-класс / Г.К. Качан – Минск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2019. – 72 с.: іл. – (Энцыклапедыя народного мастера);
5. Кукла Масленица. Форум [Электронный ресурс]. – Режим доступа: tridevatoecarstvo.com›showthread.php…
6. Обереговые куклы [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://rebenok.by/community/attach/2010/03/19/204193
7. Памяць: Гістарычна-дакументальная хроніка Докшыцкага раёна / рэд.кал.: Г.П.Пашкоў (гал.рэд.) і інш. – Мінск: БелЭН, 2004. – 752 с.;
8. Рублёва, И.А. Кукла Коляда / И.А. Рублёва // Ксюша. Для любителей рукоделия. – 2014. – №10 – С.10 –11;
9. Славянские куклы-обереги и их значение [Электронный ресурс]. – Режим доступа: vashobereg.ru›kukly/kukly-oberegi

10. Славянские куклы-обереги. Праздничный мир [Электронный ресурс]. – Режим доступа: prazdnichnyymir.ru›den-semi/5695…kukly-oberegi-1/
11. Славянские куклы-обереги. Славянская культура [Электронный ресурс]. – Режим доступа: slavyanskaya-kultura.ru›Культура›Ремесла
12. Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя / рэд.кал.: І.П.Шамякін (гал.рэд.) і інш. – Мінск: БелСЭ, 1989. – С.53 – 54.

Сборник региональных творческо-
исследовательских и социально значимых проектов
**«Проектная деятельность как средство развития
творческо-исследовательской и социально значимой деятельности
учащихся»**

Панорама регионального опыта
опорных методических площадок учреждений дополнительного
образования детей и молодежи Витебской области

Ответственный за выпуск *Юлия Александровна Хома*
Составитель *Наталья Петровна Харитонова*
Дизайн обложки *Наталья Сергеевна Романовская*

Государственное учреждение дополнительного образования
«Витебский областной дворец детей и молодежи»

210602, г. Витебск, пр. Фрунзе, д.94.
Тел.: 8(0212) 68 86 33. E-mail: metod.otdel@centers.by
https://centers.by/